# УВАГА

Гэты варыянт Канстытуцыі і Статуту Асацыяцыі Беларусаў Амэрыкі быў канчаткова прыняты на чарговым паседжаньні Галоўнай управы 3 сакавіка, 2022 году на падставе інтэрнэт-галасаваньняў і галасаваньняў падчас паседжаньняў Галоўнай управы 24 лютага і 3 сакавіка 2022 году.
Агульная колькасьць сяброў Галоўнай Управы АБА: 36
Агульная колькасьць НАА: 24

**Пытаньне 1:**
*Ці галасуеце вы за тое, каб прыняць бягучую вэрсыю Канстытуцыі АБА як афіцыйную?*
Прынялі ўдзел у галасаваньні: 22 сябры ГУ, 16 НАА

- За - 21 сябар ГУ, 15 НАА
- Супраць - 0
- Устрымаліся - 1 сябар ГУ, 1 НАА

**Пытаньне 2:**
*Ці галасуеце вы за тое, каб прыняць бягучую вэрсыю Статуту АБА як афіцыйную?*
Прынялі ўдзел у галасаваньні: 24 сябры ГУ, 18 НАА

- За - 20 сяброў ГУ, 15 НАА
- Супраць - 0
- Устрымаліся - 4 сябры ГУ, 3 НАА

# ЗЬМЕСТ


ЗЬМЕСТ 1

КАНСТЫТУЦЫЯ 3

Уводзіны 3
Назва 3
Тэрыторыя 3
Мова 3
Зьмены 3
Уступленьне ў сілу 4
Характар арганізацыі, мэты і задачы 4
Характар і прынцыпы працы 4
Мэты і задачы 4
Сябры 5
Арганізацыйная структура 6

СТАТУТ 7

Вызначэньні 7
Сябры, іх правы і абавязкі 8
Віды сяброўства 8
Сябры АБА 8
Ганаровыя сябры 9
Сябры Галоўнай управы 9
Незалежная арганізацыйная адзінка 9
Выключэньні 10
Патрабаваньні да кандыдатаў у сябры Галоўнай управы 10
Уступленьне ў сябры Галоўнай управы 11
Правы і Абавязкі сяброў Галоўнай управы 12
Спыненьне сяброўства 13
Прыхільнікі 14
Патрабаваньні да кандыдатаў у прыхільнікі 14
Уступленьне ў прыхільнікі 14
Правы і абавязкі прыхільнікаў 14
Прыпыненьне сяброўства прыхільнікаў 15
Сяброўскія ахвяраваньні і складкі 15
Галоўная ўправа 16
Склад 16
Дзейнасьць Галоўнай управы 16
Кампэтэнцыя Галоўнай управы 16
Правы і абавязкі 17
Паседжаньне Галоўнай управы 17

- Працэдура галасаваньня 18
- Прэзыдыюм АБА 19
- Склад 19
- Выбары і тэрміны дзеяньня прэзыдыюму 19
- Дзейнасьць прэзыдыюму 20
- Паседжаньні прэзыдыюму 20
- Правы і абавязкі сяброў прэзыдыюму 21
  - Правы і абавязкі прэзыдэнта 21
  - Правы і абавязкі віцэ-прэзыдэнта 22
  - Правы і абавязкі сакратара 22
  - Правы і абавязкі скарбніка 22
  - Правы і абавязкі афіцэра па публічных сувязях 23

Камітэты 24
- Склад 24
- Мэханізм стварэньня 24
- Кіраўнік камітэту 24
- Мэханізм роспуску камітэту 25
- Доступ да матэрыялаў 25

# КАНСТЫТУЦЫЯ

## <u>Асацыяцыі Беларусаў у Амэрыцы</u>

Мы, беларусы Амэрыкі, карыстаючыся дэмакратычнымі правамі і свабодамі Амэрыканскай Канстытуцыі і маючы на мэце захаваньне беларускіх нацыянальных традыцый, мовы і звычаяў, а таксама дапамогу беларускаму народу ў пабудове і разьвіцьці дэмакратычнай незалежнай Беларусі, гэтай Канстытуцыяй пастанаўляем:

### Артыкул 1. Уводзіны

**Пар. 1.1.** Назва

Асацыяцыя беларусаў у Амэрыцы, інкарпараванае (далей ужываецца скарочаная назва – АБА).

The Association of Belarusians in America, Incorporated (hereinafter abbreviated as ABA)

**Пар. 1.2.** Тэрыторыя

Сваёй дзейнасьцю АБА абыймае ўсю тэрыторыю Злучаных Штатаў Амэрыкі (далей ЗША).

**Пар. 1.3.** Мова

Гэтая Канстытуцыя выдадзеная на дзьвюх мовах: беларускай і ангельскай. Абодва выданьні ўжываюцца як эквівалентныя. У выпадку спрэчкі або разыходжаньня тэкст на беларускай мове зьяўляецца канчатковым і абавязковым аўтарытэтам.

**Пар. 1.4.** Зьмены

п. 1.4.1. Гэтая Канстытуцыя можа быць выпраўленая ці зьмененая на паседжаньні Галоўнай управы дзьвюма трацінамі (⅔) галасоў усяго складу Галоўнай управы, прысутных асабіста ці праз пісьмовыя/электронныя ўпаўнаважаньні пры ўмове, што пастанова правесьці зьмены была прынятая на папярэднім

паседжаньні Галоўнай управы і на яе падставе адмысловай працоўнай групай быў падрыхтаваны праект зьменаў да разгляду.

п. 1.4.2. Пры прыняцьці зьменаў у Канстытуцыю захоўваецца арыгінальны тэкст, зьмены зьмяшчаюцца асобна ў папраўку Канстытуцыі з адпаведным парадкавым нумарам і са спасылкай на адпаведную частку Канстытуцыі.

п. 1.4.3. Пры прыняцьці папраўкі да Канстытуцыі, яе зьмест становіцца правамоцным, і адпаведная частка ў арыгінальнай вэрсыі губляе моц.

**Пар. 1.5.** Уваход у сілу

Гэта Канстытуцыя становіцца правамоцнаю пасьля прыняцьця яе паседжаньнем Галоўнай управы ад 3-га сакавіка 2022, усе папярэднія тэксты Канстытуцыі зьяўляюцца неправамоцнымі.

## Артыкул 2. Характар арганізацыі, мэты і задачы.

**Пар. 2.1.** Характар і прынцыпы працы

п. 2.1.1. АБА - гэта беларуская, грамадзка-асьветная, дабрачынная, некамэрцыйная, непартыйная арганізацыя.

п. 2.1.2. АБА - гэта  плятформа для супрацоўніцтва і ўзаемападтрымкі існуючых беларускіх суполак і/або беларуска-амэрыканскіх некамэрцыйных арганізацый на тэрыторыі ЗША.

п. 2.1.3. Праца АБА грунтуецца на прынцыпах і ідэалах Канстытуцыі ЗША, Статуту Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, Усеагульнай дэклярацыі правоў чалавека.

**Пар. 2.2.** Мэты і задачы

п. 2.2.1. Ажыцьцяўляць ідэі, усталяваныя гэтай Канстытуцыяй.

п. 2.2.2. Каардынаваць дзейнасьць існуючых беларускіх суполак і/або беларуска-амэрыканскіх некамэрцыйных арганізацый на

тэрыторыі ЗША і спрыяць свабоднаму абмену інфармацыяй паміж імі.

п. 2.2.3. Аб’ядноўваць беларусаў дзеля ўзаемнай дапамогі ў грамадзкай, дабрачыннай і асьветнай працы.

п. 2.2.4. Папулярызаваць веды пра беларуска-амэрыканскую супольнасьць, яе гісторыю, дзейнасьць і разьвіцьцё.

п. 2.2.5. Прадстаўляць беларуска-амэрыканскую супольнасьць перад насельніцтвам і ўрадам ЗША.

п. 2.2.6. Дапамагаць беларуска-амэрыканскай супольнасьці ў захаваньні беларускай спадчыны, гісторыі, культуры і мовы.

п. 2.2.7. Садзейнічаць фарміраваньню і разьвіцьцю спрыяльных умоваў для паўнавартаснага і ўсебаковага разьвіцьця беларускіх суполак і/або беларуска-амэрыканскіх некамэрцыйных арганізацый на тэрыторыі ЗША.

п. 2.2.8. Садзейнічаць фарміраваньню і разьвіцьцю спрыяльных умоў для паўнавартаснага і ўсебаковага разьвіцьця грамадзянскай супольнасьці на тэрыторыі Беларусі.

п. 2.2.9. Аказаньне дапамогі беларусам Амэрыкі, пацярпелым ў выніку стыхійных бедзтваў, экалягічных, прамысловых і іншых катастроф.

п. 2.2.10. Аказваць дапамогу пацярпелым беларусам, ахвярам рэпрэсый, бежанцам, вымушаным перасяленцам у выпадку надзвычайнай сытуацыі, эканамічных і палітычных крызысаў, сацыяльных, нацыянальных і рэлігійных канфліктаў у ЗША і па-за іх межамі.

п. 2.2.11. Усталёўваць і падтрымліваць грамадзкія і культурныя сувязі паміж грамадзкімі арганізацыямі беларусаў на тэрыторыі ЗША і па-за іх межамі.

**Артыкул 3. Сябры**

(i) Сябрамі АБА могуць быць асобы беларускага паходжаньня, выхадцы зь Беларусі ў яе этнаграфічных межах (паводле Яўхіма Карскага), ці асобы, зьвязаныя сваяцтвам альбо дзейнасьцю зь Беларусьсю,

старэйшыя за 18 гадоў, якія з павагай ставяцца да беларускай мовы, культуры і гісторыі, а таксама падтрымліваюць ідэі свабоднай, незалежнай Беларусі.

(ii) Ня могуць быць сябрамі АБА асобы, якія знаходзяцца пад уплывам або супрацоўнічаюць з антыдэмакратычнымі рэжымамі (напрыклад, дыктатарскімі, пракамуністычнымі і інш.), з антыамэрыканскімі арганізацыямі, з крымінальнымі структурамі, з канспірацыйнымі арганізацыямі.

(iii) Сябры абавязваюцца дзейнічаць згодна з гэтай Канстытуцыяй і Статутам АБА.

(iv) Сябры павінны быць рэзыдэнтамі ЗША ва ўзросьце 18 і болей гадоў.

(v) Сябры павінны паважаць і шанаваць нацыянальныя гістарычныя сымбалі Беларусі: бел-чырвона-белы сцяг і герб «Пагоня».

(vi) Сябры павінны паважаць АБА.

## Артыкул 4. Арганізацыйная структура

АБА складаецца з Галоўнай управы, прэзыдыюму і камітэтаў, якія выконваюць свае абавязкі згодна з гэтай Канстытуцыяй і Статутам АБА:

(i) Галоўная ўправа - гэта цэнтральны калегіяльна-прадстаўнічы кіруючы орган.

(ii) Прэзыдыюм АБА - гэта выканаўчы і прадстаўнічы орган АБА.

(iii) Камітэт - гэта выканаўчы орган, які функцыянуе на пастаяннай аснове па вызначаным Галоўнай управай накірунку.

# СТАТУТ

## Асацыяцыі Беларусаў у Амэрыцы

### СЕКЦЫЯ 1 Вызначэньні

У гэтым Статуце і ва ўсіх іншых актах і рэзалюцыях АБА, калі толькі не пазначана адваротнае, наступныя тэрміны выкарыстоўваюцца ў значэньнях:

(a) Галоўная ўправа - гэта цэнтральны калегіяльны кіруючы і заканадаўчы орган АБА.
(b) Прэзыдыюм - пастаянны дзеючы выканаўчы і прадстаўнічы орган АБА
(c) Сябар прэзыдыюму - гэта сябар Галоўнай управы, абраны на адну з пасадаў прэзыдыюму.
(d) Камітэт - гэта выканаўчы орган, які функцыянуе на пастаяннай аснове па вызначаным Галоўнай управай накірунку.
(e) Незалежная арганізацыйная адзінка (НАА) - існуючая беларуская суполка і/або зарэгістраваная беларуска-амэрыканская некамэрцыйная арганізацыя на тэрыторыі ЗША.
(f) Рэзыдэнт ЗША - асоба, якая большую частку каляндарнага году легальна пражывае на тэрыторыі ЗША.
(g) Прадстаўнік НАА - сябар Галоўнай управы, які ўпаўнаважаны прадстаўляць НАА ў Галоўнай управе.
(h) Намесьнік прадстаўніка НАА - сябар Галоўнай управы, які ўпаўнаважаны выконваць абавязкі прадстаўніка НАА ў Галоўнай управе ў выпадку немагчымасьці выконваць абавязкі сябрам Галоўнай управы, абраным прадстаўніком НАА.

## СЕКЦЫЯ 2 Сябры, іх правы і абавязкі

2.1. Віды сяброўства

2.1.1. Сябры АБА
Сябры АБА падзяляюцца на
(i) Сяброў Галоўнай управы;
(ii) Сяброў прыхільнікаў (далей прыхільнік);

2.1.2. Ганаровыя сябры
У выключных выпадках, асобе, якая мае выбітныя дасягненьні ў працы на карысьць беларускага народу ці АБА, можа надавацца званьне ганаровага сябра.
(i) Кандыдат становіцца ганаровым сябрам, калі ў выніку галасаваньня на паседжаньні Галоўнай управы яго, высунутую толькі сябрам ГУ, кандыдатуру падтрымае ня менш за дзьве траціны (2/3) агульнай колькасьці сяброў Галоўнай управы.
(ii) Званьне ганаровага сябра можа быць скасаванае Галоўнай управай шляхам галасаваньня мінімум дзьвюма трацінамі галасоў (2/3) агульнай колькасьці сяброў Галоўнай управы.
(iii) Ганаровыя сябры не зьяўляюцца сябрамі АБА, але абавязаныя адпавядаць крытэрам, дадзеным у п. (i) (ii) (v) (vi) артыкулу III Канстытуцыі.
(iv) Ганаровыя сябры вызваляюцца ад выплаты штогадовых сяброўскіх складак

2.2. Сябры Галоўнай управы

Сябрамі Галоўнай управы зьяўляюцца абраныя прадстаўнікі незалежных арганізацыйных адзінак (НАА).

2.2.1. Незалежная арганізацыйная адзінка
Незалежная арганізацыйная адзінка (НАА) - гэта (гл. Слоўнік (I)) існуючая беларуская суполка і/або беларуска-амэрыканская зарэгістраваная некамэрцыйная арганізацыя на тэрыторыі ЗША.
(i) Беларуская суполка
Беларускай суполкай у ЗША лічыцца суполка, аб’яднаная па тэрытарыяльнай прыкмеце, што ў сваім складзе мае: (i) 20 і

больш зарэгістраваных удзельнікаў, якія адпавядаюць крытэрам, дадзеным у артыкуле III Канстытуцыі; (ii) афіцыйную дзеючую анлайн групу (чат) у сацыяльных мэдыя ці вэбсайт, што актыўна працуе на разьвіцьцё беларускай дыяспары ў ЗША і дасягненьне мэтаў і задачаў, прапісаных у п. 2.2 Канстытуцыі.

(ii) Беларуска-амэрыканская некамэрцыйная арганізацыя Беларуска-амэрыканскай некамэрцыйнай арганізацыяй зьяўляецца афіцыйна зарэгістраваная на тэрыторыі ЗША некамэрцыйная арганізацыя, якая сваёй дзейнасьцю адпавядае мэтам і задачам, прапісаным у п. 2.2 Канстытуцыі.

2.2.2. Выключэньні

(i) У выключных выпадках сябрам Галоўнай управы можа быць рэзыдэнт ЗША беларускага паходжаньня, які(ая) (і) актыўна ўдзельнічае ў жыцьці беларускай дыяспары ў ЗША больш за 2 гады або (ii) які(ая) зьяўляецца заснавальнікам сацыяльнага, асьветніцкага, дасьледча-навуковага ці творчага праекту на карысьць і разьвіцьцё беларускай дыяспары ў ЗША або (iii) зьяўляецца заснавальнікам ці старшынёй зарэгістраванай на тэрыторыі ЗША некамэрцыйнай арганізацыі і які(ая) сваім дазнаньнем і ведамі гатовы(ва) актыўна дапамагаць у дасягненьні мэтаў і задачаў, прапісаных у п. 2.2 Канстытуцыі.

(ii) Колькасьць сяброў Галоўнай управы, абраных у адпаведнасьці з п. 2.2.2. Статуту, ня можа перавышаць адну трэціну (1/3) ці больш ад агульнай колькасьці сяброў Галоўнай управы.

2.2.3. Патрабаваньні да кандыдатаў у сябры Галоўнай управы

Для таго каб стаць сябрам Галоўнай управы, кандыдат мусіць:

(i) Адпавядаць крытэрам, апісаным у артыкуле III Канстытуцыі,

(ii) Прадставіць неабходныя сьведчаньні таго, што беларуская суполка ці/і некамэрцыйная арганізацыя, якую прадстаўляе кандыдат у сябры Галоўнай управы, адпавядае крытэрам НАА, апісаным у п. 2.2.2-3 Статуту. Выключэньнем з гэтага пункту зьяўляецца кандыдат ў сябры Галоўнай управы, які адпавядае крытэрам, апісаным у п. 2.2.4 Статуту.

(iii) Спраўдзіць, што НАА, якую прадстаўляе кандыдат у сябры Галоўнай управы, яшчэ ня мае прадстаўніцтва ў Галоўнай управе.

(iv) Прадставіць неабходныя сьведчаньні таго, што дзейнасьць НАА, якую прадстаўляе кандыдат у сябры Галоўнай управы, не супярэчыць прынцыпам, апісаным у Канстытуцыі. Выключэньнем з гэтага пункту зьяўляецца кандыдат у сябры Галоўнай управы, які адпавядае крытэрам, апісаным у п. 2.2.4 Статуту.

(v) Прадставіць неабходныя сьведчаньні таго, што кандыдат зьяўляецца абраным прадстаўніком НАА. Працэдура абраньня прадстаўніка і яго намесьніка вызначаецца НАА. Выключэньнем з гэтага пункту зьяўляецца кандыдат у сябры Галоўнай управы, які адпавядае крытэрам, апісаным у п. 2.2.4 Статуту.

(vi) Падаць заяву аб сяброўстве ў Галоўнай управе ў электронным ці пісьмовым выглядзе любому сябру Галоўнай управы або праз афіцыйны вэбсайт АБА, або на афіцыйную электронную пошту АБА;

(vii) Падтрымліваць мэты і задачы, прапісаныя ў п. 2.2 Канстытуцыі на момант падачы заявы і ў будучыні;

(viii) Заплаціць сяброўскія складкі, калі яны прадугледжаныя.

2.2.4. Уступленьне ў сябры Галоўнай управы

(i) Заява аб сяброўстве ў Галоўнай управе падаецца ў Галоўную управу, якая абавязваецца разгледзець заяву на працягу трыццаці (30) дзён з моманту атрыманьня;

(ii) Заплаціць сяброўскія складкі. Сяброўскія складкі ў памеры $100 (ста даляраў ЗША) павінны быць аплачаны не пазьней як праз 48 гадзін пасьля атрыманьня ад Сакратара ліста аб прыняцьці асобы ў склад сяброў АБА.За спраўджваньне аплаты складкі ва ўстаноўленым ГУ памеры адказвае Сакратар. У выпадку нявыплаты сяброўскіх складак у вызначаны тэрмін, заяўка будзе скасавана.

(iii) Калі Галоўная ўправа вырашае галасаваньнем згодна з п.3.5 Статуту, што беларуская суполка ці/і некамэрцыйная

арганізацыя, якую прадстаўляе кандыдат у сябры Галоўнай управы, адпавядае крытэрам НАА, апісаным у п. 2.2.2-3 Статуту, а кандыдат у сябры Галоўнай управы задавальняе патрабаваньні, апісаныя у п. 2.2.5 Статуту, кандыдат у сябры Галоўнай управы неадкладна становіцца сябрам Галоўнай управы з усімі прыдатнымі правамі і абавязкамі, апісанымі ніжэй (Указаць пункты).

(iv) Калі Галоўная ўправа вырашае, што арганізацыя, якую прадстаўляе кандыдат у сябры Галоўнай управы, не адпавядае крытэрам НАА, апісаным у п. 2.2.2-3 Статуту, або кандыдат у сябры Галоўнай управы не задавальняе патрабаваньні, апісаныя ў п. 2.2.5 Статуту, заява аб сяброўстве ў Галоўнай управе мусіць быць адхіленая.

(v) Кандыдат у сябры Галоўнай управы мусіць быць праінфармаваны аб рашэньні Галоўнай управы, яго прычынах і магчымых далейшых кроках на працягу 5 працоўных дзён з моманту прыняцьця рашэньня Галоўнай управай.

(vi) У выпадку адхіленьня заявы аб сяброўстве ў Галоўнай управе, кандыдат можа абскардзіць рашэньне на працягу трыццаці (30) дзён і прадаставіць Галоўнай управе дадатковыя сьведчаньні ў залежнасьці ад прычыны адмовы. На працягу трыццаці (30) дзён з моманту атрыманьня скаргі, Галоўная ўправа мусіць паўторна разгледзець заяву аб сяброўстве ў Галоўнай управе. У выпадку адхіленьня заявы ў другі раз рашэньне Галоўнай управы зьяўляецца канчатковым і абскарджаньню не падлягае.

2.2.5. Правы і абавязкі сяброў Галоўнай управы

(i) Права і абавязак удзельнічаць у паседжаньнях Галоўнай управы;

(ii) Права галасаваць на паседжаньнях Галоўнай управы згодна з працэдурай, апісанай у п. 3.5 Статуту;

(iii) Права дзейнічаць ад імя АБА ў судовых справах, якія зьвязаныя зь дзейнасьцю АБА;

(iv) Права карыстацца інфармацыйнымі матэрыяламі, сабранымі сябрамі АБА, на карысьць беларускай суполкі ў ЗША, а не ў асабістых мэтах;

(v) Права доступу да пратаколаў паседжаньняў Галоўнай управы і прэзыдыюму;
(vi) Права ініцыяваць імпрэзы і браць удзел ва ўсіх імпрэзах, арганізаваных сябрамі АБА;
(vii) Права выкарыстоўваць назву АБА для арганізацыі імпрэзаў і добраахвотных праектаў паводле ўзгодненага на чарговым паседжаньні Галоўнай управы рэглямэнце паводле п. 3.4. Статуту і п. 3.5 Статуту.
(viii) Абавязак дзейнічаць згодна з Канстытуцыяй і Статутам АБА, а таксама працаваць на карысьць і разьвіцьцё беларускай дыяспары ў ЗША;
(ix) Абавязак спрыяць рэалізацыі мэтаў і задачаў АБА, прапісаных у п. 2.2 Канстытуцыі;
(x) Абавязак актыўна ўдзельнічаць у працы ў НАА і камітэтах АБА;
(xi) Абавязак сумленна выконваць рашэньні Галоўнай управы;
(xii) Абавязак сумленна прадстаўляць НАА на мясцовым і глябальным узроўні;
(xiii) Абавязак сумленна прадстаўляць інтарэсы НАА ў Галоўнай управе;
(xiv) Абавязак спраўна плаціць штогадовыя сяброўскія складкі.

2.2.6. Спыненьне сяброўства

(i) Выхад з АБА можа быць добраахвотны;
(ii) Сябар, які сваёй дзейнасьцю прыносіць шкоду працы АБА, або парушае Кастытуцыю ці Статут АБА, або нядобрасумленна выконвае свае абавязкі, можа быць выключаны зь сяброўства ў АБА Галоўнай управай шляхам галасаваньня паводле п. 3.5 Статуту. Выключэньне сябра Галоўнай управы можа адбыцца толькі пасьля абмеркаваньня і прадстаўленьня належных доказаў.
(iii) Сяброўства анулюецца пры неаплаце гадавых складак бяз паважнай прычыны і пасьля двух электронна-пісьмовых напамінаў, з аўтаматычным аднаўленьнем сяброўства пры аплаце запазычанасьці.

(iv) З моманту вынясеньня рашэньня аб спыненьні сяброўства ў Галоўнай управе ўсе правы і абавязкі сябра спыняюцца.
(v) Сябар Галоўнай управы мусіць быць праінфармаваны аб спыненьні сяброўства ў Галоўнай управе і яго прычынах на працягу пяці (5) працоўных дзён з моманту прыняцьця рашэньня Галоўнай управай.
(vi) У выпадку спыненьня сяброўства ў Галоўнай управе, сябар можа абскардзіць рашэньне на працягу дзесяці (10) працоўных дзён і прадаставіць Галоўнай управе дадатковыя сьведчаньні спыненьня сяброўства. На працягу дзесяці (10) працоўных дзён з моманту атрыманьня апэляцыі, Галоўная ўправа мусіць яе разгледзець.
(vii) У выпадку адхіленьня апэляцыі рашэньне Галоўнай управы зьяўляецца канчатковым і не абскарджваецца.
(viii) У выпадку перагляду рашэньня аб прыпыненьні сяброўства ў Галоўнай управе, усе правы і абавязкі сябра Галоўнай управы аднаўляюцца.
(ix) У выпадку, калі сябар Галоўнай управы на працягу каляндарнага году ня ўдзельнічаў у па меншай меры палове паседжаньняў Галоўнай управы, любы з прадстаўнікоў Галоўнай управы мае права паставіць пытаньне аб выключэньні са складу такога сябра і аб выбары новага сябра Галоўнай управы.
(x) У выпадку калі НАА, якую прадстаўляе сябар Галоўнай управы, прыпыняе сваё існаваньне ці перастае адпавядаць крытэрам, апісаным у п. 2.2.2 - п. 2.2.3 Статуту, АБА мусіць разгледзець пытаньне аб выключэньні сябра са складу Галоўнай управы на чарговым паседжаньні Галоўнай управы.

2.3. Прыхільнікі

Прыхільнікам можа стаць любы рэзыдэнт ЗША пры выкананьні наступных умоваў:

2.3.1. Патрабаваньні да кандыдатаў у прыхільнікі

Для таго, каб стаць прыхільнікам, кандыдат у прыхільнікі мусіць:
(i) Адпавядаць крытэрам, апісаным у артыкуле III Канстытуцыі;

(ii) Падаць заяву аб сяброўстве ў электронным ці папяровым выглядзе любому сябру Сябру Прэзідыюма Галоўнай Управы або праз афіцыйны вэбсайт АБА;

(iii) Падтрымліваць мэты і задачы, прапісаныя ў п. 2.2 Канстытуцыі на момант падачы заявы і ў будучыні;

(iv) Заплаціць сяброўскія складкі.Сяброўскія складкі ў памеры $100 (ста даляраў ЗША) павінны быць аплачаны не пазьней як праз 48 гадзін пасьля атрыманьня ад Сакратара ліста аб прыняцьці асобы ў склад сяброў-прыхільнікаў АБА.За спраўджваньне аплаты складкі ва ўстаноўленым ГУ памеры адказвае Сакратар. У выпадку нявыплаты сяброўскіх складак у вызначаны тэрмін, заяўка будзе скасавана.

2.3.2. Уступленьне ў Прыхільнікі

(i) Заява кандыдата ў прыхільнікі разглядаецца Прэзідыюмам Галоўнай Управы;

(ii) Сакратар павінен праінфармаваць раз на месяц ГУ АБА аб прыняцьці рашэньняў наконт заяўленых кандыдатаў;

(iii) Пры станоўчым або адмоўным вырашэньні кандыдат павінен быць праінфармаваны наконт стану яго/яе заявы ў тэрмін 15 працоўных дзён.

2.3.3. Правы і абавязкі прыхільнікаў

(i) Права актыўнага і пасыўнага выбару (і ўдзелу) ў працоўныя групы ці праекты АБА;

(ii) Права на ўдзел у выніковым штогодным паседжаньні з магчымасцю ўносіць прапановы або заўвагі па дзейнасьці Камітэтаў і АБА ўвогуле;

(iii) Права ўдзелу ў працы камітэтаў;

(iv) Права карыстаньня ўсімі прыладамі і напрацоўкамі АБА ў межах рэгламэнту, вызначанага Галоўнай упраавай;

(v) Права прымаць удзел у выбарах Прэзідыюму з правам голасу пры ўмове, што Прыхільнік з'яўляецца сябрам-прыхільнікам АБА больш за 10 месяцаў ад даты аплаты сяброўскіх складак;

(vi) Права мець зьніжку на платныя імпрэзы арганізаваныя Сябрамі ГУ АБА. Зьніжка вызначаецца Сябрам ГУ, які з'яўляецца арганізатарам імпрэзы. Зьніжка не можа быць менш за 5% ад кошту квітка.

(vii) Абавязак спрыяць рэалізацыі мэтаў і задачаў АБА, прапісаных ў п. 2.2 Канстытуцыі;

(viii) Абавязак спраўна плаціць штогадовыя сяброўскія складкі ў памеры $100 (ста даляраў ЗША) пры ўступленьні і штогадова да першага кастрычніка кожнага года. Сума складак з'яўляецца канчатковай, і не падляжыць вяртанню ні пры якіх умовах, у тым ліку пры выключэнні з сяброў-прыхільнікаў згодна п. 2.3.4. Статута.

2.3.4. Прыпыненьне сяброўства прыхільнікаў

(i) Прыпыненьне сяброўства прыхільнікаў можа быць добраахвотным, або на аснове пастановы Галоўнай управы;

(ii) Сяброўства анулюецца пры неаплаце гадавых складак бяз паважнай прычыны і пасьля двух электронна-пісьмовых напамінаў, з аўтаматычным аднаўленьнем сяброўства пры аплаце запазычанасьці.

(iii) З моманту вынясеньня рашэньня аб прыпыненьні сяброўства Галоўнай управай ўсе правы і абавязкі сябра прыпыняюцца.

(iv) Сябар прыхільнік мусіць быць праінфармаваны аб прыпыненьні сяброўства і яго прычынах на працягу пяці (5) працоўных дзён з моманту прыняцьця рашэньня Галоўнай управай.

(v) У выпадку прыпыненьня сяброўства прыхільніка, сябар прыхільнік можа абскардзіць рашэньне на працягу дзесяці (10) дзён і прадаставіць Галоўнай управе дадатковыя сьведчаньні ў залежнасьці ад прычыны прыпыненьня сяброўства. На працягу дзесяці (10) дзён з моманту атрыманьня апэляцыі, Галоўная ўправа мусіць паўторна разгледзець рашэньне аб прыпыненьні сяброўства.

(vi) У выпадку паўторнага рашэньня аб прыпыненьні сяброўства, рашэньне Галоўнай управы зьяўляецца канчатковым і не абскарджваецца.

(vii) У выпадку перагляду рашэньня аб прыпыненьні сяброўства, усе правы і абавязкі сябра прыхільніка аднаўляюцца.

2.4. Сяброўскія ахвяраваньні і складкі

(i) Сябар АБА мае права рабіць добраахвотнае ахвяраваньне на дзейнасьць АБА у любым памеры зь любой пэрыядычнасьцю.
(ii) Галоўная управа большасьцю галасоў мае права ўводзіць сяброўскія складкі, зьмяняць іх памер і пэрыядычнасьць.
(iii) Памер і пэрыядычнасьць сяброўскіх складак ня можа зьмяняцца часьцей, чым раз на 2 гады.
(iv) На падставе пісьмовай ці электроннай заявы ў адвольнай форме на імя Сакратара АБА, памер складак з паважлівых прычынаў (як цяжкае фінансавае становішча, беспрацоўнасць і інш.) і пры прадстаўленьні доказаў, можа быць зьніжаны, або адменены рашэньнем Галоўнай Управы.
(v) З 1 кастрычніка 2024-га года ўводзяцца складкі ў памеры $100 (сто даляраў ЗША) у год. Складкі мусяць быць выплачаныя да 1 кастрычніка кожнага году.

## СЕКЦЫЯ 3 Галоўная ўправа

3.1. Галоўная ўправа

Галоўная ўправа зьяўляецца цэнтральным калегіяльным кіруючым і заканадаўчым органам і выконвае свае абавязкі згодна з Канстытуцыяй і Статутам АБА.

3.2. Склад

(i) Галоўная ўправа складаецца зь сяброў Галоўнай управы паводле п. 2.2 Статуту. Гэта ўключае прадстаўнікоў НАА і сяброў Галоўнай управы, якія задавальняюць крытэрам, апісаным у п. 2.2.2 Статуту.
(ii) У складзе Галоўнай управы можа быць толькі адзін (1) прадстаўнік НАА і адзін (1) намесьнік прадстаўніка НАА.

(iii) Сябры Галоўнай управы выконваюць свае абавязкі на працягу двух (2) гадоў, або да часу абраньня іх наступнікаў.

3.3. Дзейнасьць Галоўнай управы

3.3.1. Кампэтэнцыя Галоўнай управы

Да кампэтэнцыі Галоўнай управы належаць:

(i) зьмены Статуту;
(ii) прыняцьце і выключэньне сяброў;
(iii) абраньне і спыненьне паўнамоцтваў сяброў прэзыдыюму;
(iv) прыняцьце справаздачаў працоўных груп і камітэтаў АБА;
(v) устанаўленьне кірунку дзейнасьці АБА і камітэтаў;
(vi) супрацоўніцтва зь іншымі некамэрцыйнымі і камэрцыйнымі праектамі і арганізацыямі;
(vii) вызначэньне памеру сяброўскіх складак АБА (вырашэньне выносіцца раз на год);
(viii) распараджэньне, разьмеркаваньне і кантроль фінансавых сродкаў АБА;
(ix) вырашэньне спрэчных пытаньняў паміж сябрамі арганізацыі;

3.3.2. Правы і абавязкі

(i) Абавязак рабіць усе захады дзеля разьвіцьця і росту арганізацыі, а таксама дасягненьня мэтаў і задачаў, прапісаных ў п. 2.2 Канстытуцыі.
(ii) Права запытваць справаздачы дзейнасьці прэзыдыюму і камітэтаў.

3.4. Паседжаньне Галоўнай управы

3.4.1. Галоўная ўправа рэгулярна зьбіраецца асабіста або праз відэа/аўдыё сувязь для абмеркаваньня агульных каардынацыйных пытаньняў, справаздачы камітэтаў і працоўных груп, а таксама іншых пытаньнях, зьвязаных з працай арганізацыі.

3.4.2. Пэрыядычнасьць сустрэчаў вызначаецца штогод Галоўнай управай.

3.4.3. Для вырашэньня тэрміновых пытаньняў пазачарговае паседжаньне Галоўнай управы можа склікаць
(i) Прэзыдэнт
(ii) Віцэ-прэзыдэнт пры адсутнасьці прэзыдэнта ці немагчымасьці ім выконваць абавязкі
(iii) любы сябар Галоўнай управы пры падтрымцы большасьці сяброў Галоўнай управы.

3.4.4. Тэрмін паміж папярэднім і наступным паседжаньнямі ня можа быць больш за адзін (1) месяц.

3.4.5. Дата паседжаньня і парадак вызначаюцца пераважнай большасьцю галасоў сяброў Галоўнай управы і паведамляецца ўсім сябрам Галоўнай управы не пазьней чым за чатыры (4) дні да правядзеньня паседжаньня.

3.4.6. Паседжаньне можна лічыць правамоцным у выпадку прысутнасьці на ім ня менш за палову сяброў Галоўнай управы (кворуму). Пры падліку агульнай колькасьці сяброў Галоўнай управы і колькасьці прысутных на паседжаньні Галоўнай управы, прадстаўнік НАА і яго намесьнік лічацца за аднаго (1) сябра.

3.4.7. Пры адсутнасьці кворуму паседжаньне Галоўнай управы пераносіцца на тэрмін, вызначаны большасьцю прысутных на паседжаньні або мадэратарам паседжаньня, але ня больш чым на два тыдні.

3.4.8. Мадэратарам паседжаньня можа быць добраахвотнік зь ліку сяброў Галоўнай управы, прысутны на паседжаньні, пры ўмове падтрымкі кандыдатуры большасьцю прысутных удзельнікаў паседжаньня.

3.4.9. На паседжаньні Галоўнай управы вядзецца пратакол, які публікуецца не пазьней чым за тры (3) працоўныя дні з дня правядзеньня паседжаньня.

3.4.10. У пратаколе занатоўваюцца
(i) Месца і час;
(ii) Склад сяброў, прысутных на паседжаньні;
(iii) Парадак дня паседжаньня;
(iv) Пытаньні, пастаўленыя на галасаваньне, і вынікі галасаваньня;
(v) Любая дадатковая інфармацыя і рашэньні.

3.4.11. Пратакол паседжаньня вядзецца сакратаром. Пры адсутнасьці сакратара ці немагчымасьці ім выконваць абавязкі, пратакаліраваць паседжаньне можа добраахвотнік зь ліку сяброў Галоўнай управы, якога падтрымала большасьць сяброў Галоўнай управы, прысутных на паседжаньні.

3.4.12. Абраны мадэратар паседжаньня зацьвярджае правільнасьць пратаколу.

3.5. Працэдура галасаваньня

Галасаваньне - асноўны спосаб прыняцьця рашэньняў Галоўнай управы.

3.5.1. Рашэньні Галоўнай управы маюць сілу пры ўдзеле ў галасаваньні больш за палову складу Галоўнай управы.

3.5.2. Пастановы і рашэньні Галоўнай управы прымаюцца бальшынёй (50% +1) галасоў удзельнікаў галасаваньня. Выключэньнем зьяўляецца галасаваньне па ўнясеньні зьменаў у Канстытуцыю, якія могуць быць прынятыя толькі пры згодзе двух трацінаў (2/3) усяго складу Галоўнай управы.

3.5.3. У выпадку роўнасьці галасоў вырашальнае значэньне мае голас прэзыдэнта ці віцэ-прэзыдэнта, пры адсутнасьці прэзыдэнта.

3.5.4. Сябар Галоўнай управы галасуе асабіста. Перадача права голасу іншай асобе, акрамя намесьніка зь ліку сваёй НАА, не дапускаецца.

3.5.5. Абраны прадстаўнік НАА і намесьнік прадстаўніка НАА зьяўляюцца ўзаемазамяняльнымі - пры прыняцьці рашэньняў улічваецца толькі адзін (1) голас ад НАА.

3.5.6. У выпадку канфлікту галасоў прадстаўніка НАА і яго намесьніка вырашальнае значэньне мае голас прадстаўніка НАА.

3.5.7. Для апэрацыйных пытаньняў, па якіх гэтым Статутам не прадугледжанае галасаваньне на паседжаньні Галоўнай управы, магчымыя іншыя формы галасаваньня. Пры гэтым любы сябар Галоўнай управы можа патрабаваць абмеркаваньня пытаньня на паседжаньні Галоўнай управы да працэдуры галасаваньня.

## СЕКЦЫЯ 4 Прэзыдыюм АБА

Прэзыдыюм АБА зьяўляецца пастаянным выканаўчым і прадстаўнічым органам АБА, які выконвае свае абавязкі згодна з Канстытуцыяй і Статутам АБА.

4.1. Склад

Прэзыдыюм складаецца з сяброў Прэзыдыюму:
(i) Прэзыдэнта,
(ii) Віцэ-прэзыдэнта,
(iii) Сакратара,
(iv) Скарбніка,
(v) Афіцэра па публічных сувязях.

4.2. Выбары і тэрміны дзеяньня прэзыдыюму

4.2.1. Пасады Прэзыдыюму АБА зь ліку сяброў Галоўнай управы выбіраюцца і зацьвярджаюцца паседжаньнем Галоўнай управы.
4.2.2. Сябры Прэзыдыюму выконваюць сваю дзейнасьць бясплатна на працягу 2-гадовай кадэнцыі ці да часу выбараў іх наступнікаў.
4.2.3. Сьпіс кандыдатаў на пасады Прэзыдыюму складае Сакратар на падставе прапаноў, пададзеных сябрамі Галоўнай управы.
4.2.4. Сябры Галоўнай управы маюць права датэрмінова спыніць паўнамоцтвы Прэзыдыюму або яго асобных сяброў.
4.2.5. У выпадку, калі сябар Прэзыдыюму без паважных прычын на працягу года ня ўдзельнічаў у палове (і больш) паседжаньняў Прэзыдыюму, любы сябар Прэзыдыюму на чарговым сходзе Галоўнай управы можа паставіць пытаньне аб яго выключэньні са складу Прэзыдыюму і аб выбары новага сябра Прэзыдыюму.
4.2.6. Выбары ў Прэзідыюм адбыліся, калі ў галасаванні ўдзельнічала больш за палову складу Галоўнай Управы і любая колькасць сяброў Прыхільнікаў.

4.3. Дзейнасьць Прэзыдыюму

4.3.1. Ажыцьцяўляе кантроль і каардынацыю выкананьня статуту.

4.3.2. Распрацоўвае і выносіць на абмеркаваньне паседжаньня Галоўнай управы асноўныя накірункі дзейнасьці АБА, доўгатэрміновыя праграмы і праекты.
4.3.3. Распрацоўвае інструкцыі па справаводзтве, парадак бягучага і архіўнага захоўваньня дакумэнтаў.
4.3.4. Ажыцьцяўляе фінансава-гаспадарчую дзейнасьць, распараджаецца грашовымі сродкамі, якія знаходзяцца ў кіраваньні АБА, у адпаведнасьці з парадкам, які зацьвярджаецца Галоўнай управай.
4.3.5. Зацьвярджае гадавую бухгалтарскую справаздачу.
4.3.6. Прэзыдыюм ня мае права ажыцьцяўляць якія-небудзь фінансава-грашовыя апэрацыі без рашэньня Галоўнай управы.
4.3.7. Прэзыдыюм ня можа вырашаць пытаньні, аднесеныя Статутам АБА да кампэтэнцыі Галоўнай управы згодна з п. 3.3. Статуту.

4.4. Паседжаньні Прэзыдыюму

4.4.1. Паседжаньні Прэзыдыюму праводзяцца па меры неабходнасьці, але не радзей за адзін раз на квартал.
4.4.2. Прэзыдэнт АБА арганізуе працу Прэзыдыюму, вядзе яго паседжаньні, забясьпечвае вядзеньне пратаколу, яго афармленьне, падпісвае пратакол паседжаньняў. У адсутнасьць Прэзыдэнта паседжаньне Прэзыдыюму вядзе Віцэ-прэзыдэнт, а ў яго адсутнасьць - сябар Прэзыдыюму ў адпаведнасьці з рашэньнем сяброў Прэзыдыюму, прысутных на паседжаньні.
4.4.3. На патрабаваньне любога сябра Прэзыдыюму або 20 (дваццаці) і больш адсоткаў сяброў Галоўнай управы, Прэзыдэнт абавязаны правесьці паседжаньне Прэзыдыюму ў тэрмін ня больш за два тыдні з даты атрыманьня ў пісьмовым выглядзе патрабаваньня аб скліканьні Прэзыдыюму, з указаньнем пытаньняў і неабходнасьці іх тэрміновага разгляду.
4.4.4. Адмовіць у скліканьні Прэзыдыюму Прэзыдэнт можа толькі ў тым выпадку, калі прапанаванае да разгляду пытаньне не адпавядае кампэтэнцыі Прэзыдыюму або патрабаваньням Статуту.
4.4.5. Паседжаньні Прэзыдыюму правамоцныя ў выпадку прысутнасьці на ім больш за палову сяброў Прэзыдыюму і Прэзыдэнта (кворуму).

4.4.6. Пры адсутнасьці кворуму паседжаньне Прэзыдыюму пераносіцца на тэрмін, вызначаны прэзыдэнтам або асобай, што яго замяшчае, але ня больш чым на два тыдні.

4.4.7. Пастановы і рашэньні Прэзыдыюму прымаюцца большасьцю (50% +1) галасоў прысутных на паседжаньні, пры наяўнасьці кворуму. У выпадку роўнасьці галасоў вырашальнае значэньне мае голас старшынствуючага на паседжаньні.

4.4.8. Сябар Прэзыдыюму галасуе асабіста. Перадача права голасу сябра Прэзыдыюму іншай асобе не дапускаецца.

4.4.9. Дата паседжаньня і парадак вызначаюцца пераважнай большасьцю сяброў Прэзыдыюму і паведамляюцца ўсім сябрам прэзыдыюму не пазьней чым за чатыры (4) дні да правядзеньня паседжаньня.

4.4.10. На паседжаньні Прэзыдыюму вядзецца пратакол, які публікуецца не пазьней чым праз тры (3) працоўныя дні з дня правядзеньня паседжаньня.

4.4.11. У пратаколе занатоўваецца (i) Месца і час; (ii) Склад сяброў, прысутных на паседжаньні; (iii) Парадак дня паседжаньня; (iv) Пытаньні, пастаўленыя на галасаваньне, і вынікі галасаваньня; (v) Любая дадатковая інфармацыя і рашэньні.

4.4.12. Прэзыдэнт зацьвярджае пратакол паседжаньня і нясе адказнасьць за правільнасьць яго складаньня і дакладнасьць.

4.5. Правы і абавязкі сяброў Прэзыдыюму

Галоўная ўправа мае права ўнесьці дадатковыя правы і абавязкі сяброў Прэзыдыюму пры неабходнасьці.

4.5.1. Правы і абавязкі Прэзыдэнта

(i) Абавязак прадстаўляць АБА на нацыянальным і міжнародным узроўні перад уладамі, установамі і іншымі арганізацыямі ў адпаведнасьці з Канстытуцыяй, Статутам і рашэньнямі Галоўнай управы.

(ii) Права падпісваць ад імя АБА дакумэнты пасьля зацьвярджэньня Галоўнай управай.

(iii) Абавязак даваць справаздачы перад паседжаньнем Галоўнай управы аб зробленай працы і дзейнасьці АБА за мінулы пэрыяд.
(iv) Кіраваць справаводзтвам.
(v) Права ацэньваць мэтазгоднасьць выдаткаў, зробленых сябрамі Галоўнай управы пры выкананьні сваіх абавязкаў.

4.5.2. Правы і абавязкі Віцэ-прэзыдэнта

(i) Абавязак выконваць тыя функцыі і заданьні, якія вызначае яму прэзыдэнт.
(ii) У выпадку няздольнасьці прэзыдэнта выконваць свае абавязкі віцэ-прэзыдэнт пераймае правы і абавязкі прэзыдэнта.

4.5.3. Правы і абавязкі Сакратара

(i) Абавязак весьці пратаколы паседжаньняў Галоўнай управы і Прэзыдыюму.
(ii) Абавязак упарадкоўваць дакумэнты, пратаколы і справаздачы.
(iii) Абавязак трымаць у належным парадку архіў Галоўнай управы.
(iv) Абавязак весьці каляндар тэрміновых справаў.
(v) Абавязак выконваць даручэньні Прэзыдэнта.

4.5.4. Правы і абавязкі Скарбніка

(i) Абавязак весьці ўлік прыбыткаў і выдаткаў.
(ii) Абавязак вядзеньня фінансавых рахункаў.
(iii) Афармляць паступленьне сродкаў і аплочваць рахункі на выдаткі, зацьверджаныя Галоўнай управай або Прэзідыюмам.
(iv) Мае права рабіць выплаты з мэтавых сродкаў бяз зацьверджання Галоўнай Управы (sponsor locked funds)
(v) Абавязак складаньня гадавой бухгалтарскай справаздачы для падатковых уладаў ЗША і Галоўнай управы.

4.5.5. Правы і абавязкі афіцэра па публічных сувязях

(i) Абавязак фарміраваць і рэалізоўваць інфармацыйна-рэклямную стратэгію;
(ii) Абавязак прымаць удзел у напісаньні і падрыхтоўцы прэзэнтацый і прэс-рэлізаў;
(iii) Абавязак разгляду запытаў ад прэсы і іншых арганізацый;
(iv) Абавязак і права арганізацыі і наведваньня рэклямных мерапрыемстваў, такіх як прэс-канфэрэнцыі, дні адчыненых дзьвярэй, выставы, экскурсыі і прэзэнтацыі:
(v) Абавязак аналізу асьвятленьня дзейнасьці АБА у сродках масавай інфармацыі.
(vi) Права публічных выступаў, удзелу ў інтэрвію, прэс-канфэрэнцыях і прэзэнтацыях ад імя АБА;
(vii) Права ўзаемадзеяньня з грамадзкасьцю, іншымі арганізацыямі, сродкамі масавай інфармацыі ад імя АБА.

4.6. Спыненьне паўнамоцтваў сяброў Прэзыдыюму

(i) Сябар прэзыдыюму можа добраахвотна скласьці свае паўнамоцтвы да заканчэньня тэрміну;
(ii) У выпадку калі сябар Прэзыдыюму без паважных прычын не выконвае свае абавязкі, Галоўная управа большасьцю галасоў можа вызваліць любога сябра Прэзыдыюму ад займаемай пасады да заканчэньня тэрміну яго паўнамоцтваў і запоўніць вакантную пасаду на астатні тэрмін зь ліку сяброў Галоўнай управы на паседжаньні Галоўнай управы, паводле п. 3.4. Статуту.

## СЕКЦЫЯ 5 Камітэты

Камітэт - гэта выканаўчы орган АБА, які функцыянуе на пастаяннай аснове па вызначаным накірунку (п. 5.3.2.).

5.1. Склад

Камітэт складаецца зь сяброў Галоўнай управы і прыхільнікаў.

### 5.2. Мэханізм стварэньня

Камітэт можа быць заснаваны любым сябрам Галоўнай управы.

- 5.2.1. На паседжаньні Галоўнай управы сябар Галоўнай управы мае права прапанаваць стварэньне новага камітэту.
- 5.2.2. Сябар Галоўнай управы абавязаны патлумачыць накірунак дзейнасьці і мэтазгоднасьць прапанаванага камітэту.
- 5.2.3. Рашэньне аб стварэньні камітэту прымаецца шляхам галасаваньня на паседжаньні Галоўнай управы згодна з п. 3.5 Статуту.

### 5.3. Кіраўнік камітэту

- 5.3.1. Сябар Галоўнай управы, які ініцыяваў стварэньне новага камітэту, аўтаматычна становіцца кіраўніком камітэту пры адсутнасьці іншых кандыдатаў з Галоўнай управы.
- 5.3.2. Пры наяўнасьці больш за аднаго кандыдата на пасаду кіраўніка камітэту Галоўная управа абірае кіраўніка камітэту большасьцю галасоў згодна з п. 3.5 Статуту.
- 5.3.3. Правы і абавязкі кіраўніка камітэту.
  - (i) Права фарміраваць склад камітэту зь ліку жадаючых сяброў Галоўнай управы і прыхільнікаў;
  - (ii) Абавязак рабіць справаздачы аб выкананай працы на кожным паседжаньні Галоўнай управы;
  - (iii) Абавязак выбраць сабе намесьніка зь сяброў Галоўнай управы;
  - (iv) Абавязак разьвіваць накірунак камітэту.
- 5.3.4. Намесьнік кіраўніка камітэту аўтаматычна становіцца кіраўніком камітэту, калі апошні больш ня ў стане выконваць свае абавязкі.
- 5.3.5. Сябар Галоўнай управы мае права быць у складзе аднаго і больш камітэтаў.
- 5.3.6. Галоўная ўправа мае права ўзьняць пытаньне аб выбарах новага кіраўніка камітэту ў любы час.

### 5.4. Мэханізм роспуску камітэту

- 5.4.1. Галоўная ўправа мае права закрыць камітэт шляхам галасаваньня (i) калі існаваньне камітэту страціла сваю мэтазгоднасьць, (ii) калі камітэт не вядзе актыўную дзейнасьць на працягу аднаго і больш квартала.

5.4.2. Усе матэрыялы, файлы, у электронным ці пісьмовым выглядзе, передаюцца ў архіў АБА і не падлягаюць зьнішчэньню.

5.5. Доступ да матэрыялаў

5.5.1. Любы прыхільнік, які ўваходзіць у склад камітэту, мае доступ да матэрыялаў, файлаў, у электронным ці пісьмовым выглядзе, гэтага камітэту.

5.5.2. Любы сябар Галоўнай управы мае доступ да матэрыялаў, файлаў, у электронным ці пісьмовым выглядзе, любога камітэту.

**СЕКЦЫЯ 6 Зьмены і ўступленьне ў сілу**

6.1. Гэты Статут можа быць выпраўлены ці зьменены на паседжаньні Галоўнай управы большасьцю галасоў усяго складу Галоўнай управы, прысутных асабіста ці праз папяровыя/электронныя ўпаўнаважаньні пры ўмове, што пастанова правесьці зьмены была прынятая на папярэднім паседжаньні Галоўнай управы і на яе падставе адмысловай працоўнай групай быў падрыхтаваны праект зьменаў да разгляду;

6.2. Гэты Статут правамоцны пасьля прыняцьця яго паседжаньнем Галоўнай управы 3 сакавіка 2022 году, усе папярэднія тэксты Статуту зьяўляюцца неправамоцнымі.